Бытует утверждение, якобы политика нас берет силой, мы все погружаемся в нее, хотим того или нет. Вопрос состоит лишь в том, действительно ли мы не хотим и стоит ли в нее погружаться всем кому не лень?

В последнее время все чаще и чаще приходится сталкиваться с некими паландинами (так называли в средние века рыцарей), "насилующими" себя выдвижением своей кандидатуры. Большинство из них с пеной у рта доказывают свою непричастность, нехотение: мол, соотечественники умоляют их искать путь в политическую элиту.

Затем, как в сказке, ненавязчиво появляется группа поддержки (естественно, на бескорыстных началах), пытающаяся объяснить, что именно "это" и есть то самое восьмое чудо света, отдающее себя на растерзание неблагодарному народу.

Именно такой идеей была одержима женщина-пенсионерка, посетившая нас на днях. Она подробно, в течение сорока минут, излагала "жизнь и судьбу", нет, не Гроссмана, а очередного кандидата:

— Он молод, горяч, ездил на полтора месяца стажироваться в Германию по вопросам коммунального хозяйства, поддерживает молодых предпринимателей, всегда хорошо выглядит и т.п.

Оказывается, достаточно быть молодым, иметь чистую обувь, опрятную одежду, пару раз побывать за границей — и... ты депутат.

Как-то странно, но положительные качества и заслуги почти всех депутатов сводятся примерно к одному — "прошел большой и сложный трудовой путь, всегда работал на пользу людям, достойными средствами добивался поставленной цели..."

Вот и получается, что не только "свежие" незапятнанные кандидаты в депутаты, но и старые, с далеко небезупречной репутацией, прошедшие, как они утверждают, девять кругов ада, вновь благодаря нашему безразличию пробивают себе дорогу, невзирая на "скромную" зарплату и "шахтерский" труд. Надо полагать, быть депутатом не так уж и плохо...

А нам, в свою очередь, не мешало бы помнить о том, что именно человек управляет привычкой, а не наоборот и куда легче избавиться от первых симптомов безразличия, чем лечить хроническое "а мне все равно".

Ольга КОСТЮКЕВИЧ.

Искусство в помощь реставрации

Гродненская хоровая капелла приглашена на гастроли во Францию.

Такую инициативу проявила одна из ассоциаций города Лиможа, побратима Гродно. Финансирует поездку французская сторона. Все вырученные от концертов средства будут направлены на реставрацию старейшего сооружения на территории современного Гродно — Коложской церкви.

Нина МАКСИМЧИК.

Зевс летит к Гее, "Галилей" — к Юпитеру

В конце мая ночью в созвездии Скорпиона будет сиять желтоватая звезда.

Это Юпитер, подчиняясь законам небесной механики, явился на свидание с Землей, хотя ближайшее расстояние между планетами составит более 600 миллионов километров. Сейчас в сторону этой гигантской планеты Солнечной системы летит созданный в США космический аппарат "Галилей", который в конце декабря этого года продолжит изучение Юпитера, начатое ранее другими американскими автоматическими межпланетными станциями.

Владимир ЛАРИОНОВ.

Народная газета

Нязгасная лампада

Мікалай ТОЛСЦІК
Мікалай ЦІТОЎ
(фота)

Без Нікольскай царквы не ўявіць Магілёў. Як Полацк без Сафійскага сабора ці Маскву без храма Васіля Блажэннага. Пад яе купалам вось ўжо тры стагоддзі жыве дух горада — спакойны, стрыманы, але нязломна ўпарты.

Каржакаватым баравіком паставілі царкву на лукавіне Дняпра адмысловыя майстры-будаўнікі са славутага Магілёўскага праваслаўнага брацтва. Таго самага, што дало Беларусі, усяму славянству выдатнага друкара Спірыдона Собаля і знакамітых мастакоў-гравёраў бацьку і сына Вашчанкаў. Адсюль, з Падніколля, не раз ляцеў над горадам звон, і мірныя рамеснікі і купцы выкочвалі на вал гарматы, каб адстаяць веру продкаў.

Яны і выстаялі разам. Магілёў і Нікольская царква. Хоць не аднойчы іх спрабавалі зруйнаваць і варожая набрыдзь, і ўласныя цемрашалы.

Не выключана, што тут расстрэльвалі: пры аднаўленні храма на яго тэрыторыі знайшлі нядаўна шмат чалавечых касцей. Была разрабавана грабніца аднаго з настаяцеляў, якога ўдзячныя прыхаджане ў мінулым стагоддзі пахавалі ў царкве.

Пасля апошняй вайны ў храме быў кніжны склад, і ў схільнага да градуснага пітва вартаўніка заўзятыя бібліяфілы выменьвалі за пляшку нават забароненыя выданні. А колькі прапілі і ўкралі ў свой час так званыя рэстаўратары! Памятаецца, кагосьці з іх нават пасадзілі. Аціраліся яны вакол царквы мо гадоў сорак. Але аднаўленчага імпэту хапала звычайна толькі на новыя рыштаванні ды дзіравы плот. Дарма, што храм унесены ЮНЕСКА ў лік найвыдатнейшых архітэктурных помнікаў.

Так, мусіць, і цягнулася б яшчэ сорак гадоў, калі б Нікольскую царкву не перадалі ранейшаму ўладальніку. Цяпер тут жаночы манастыр. Вядома ж, дзевяці інакіням і тром паслушніцам на чале з ігуменняй Яўгеніяй з вялікай будоўляй не справіцца. Але ў іх цяпер шмат памагатых: вытворчае аб'яднанне "Хімвалакно", аграгандлёвая фірма "Днепр", калгас "Камінтэрн" — усіх і не пералічыць.

Спраў яшчэ, вядома, вельмі шмат. Трэба рэстаўраваць старажытныя абразы на метале і фрэскі. Дзесьці па майстэрнях і музейных падвалах валяюцца часткі дзівоснага драўлянага іканастаса, створанага знакамітым шклоўскім разьбяром Клімам Міхайлавым, якога клікалі ажно ў Маскву — упрыгожваць Навадзевічы манастыр. Яшчэ многа належыць пабудаваць, аднавіць, вярнуць, давесці да ладу.

Але ў мінулую суботу архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Максім па блаславенню патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Аляксія II ужо асвяціў Нікольскую царкву, не чакаючы завяршэння рэстаўрацыйных работ. З дапамогай вернікаў яна хутчэй набудзе свой ранейшы выгляд.

А спрадвечную ролю нязгаснай духоўнай лампады храм на лукавіне Дняпра і не губляў ніколі.

❑ *Вакол Нікольскай царквы зноў хрэсны ход. Як тры стагоддзі назад. І як пасля нас.*

СТАЛА ВЯДОМА

Дзе падзарабіць студэнту?

Заканчваецца навучальны год у ВНУ, тэхнікумах, вучылішчах, школах. Як правесці летнія канікулы студэнтам, навучэнцам, вучням старэйшых класаў? Можна, зразумела, паехаць на паўднёвы бераг Крыма і там адпачыць.

Але наўрад ці сёння гэта рэальна для большасці з пералічаных людзей. Можа, лепш у час канікулаў дзесьці падзарабіць, каб у наступным годзе было лягчэй? Дзе, калі ўсюды ідзе масавае скарачэнне працоўных?

Аднак не спяшайцеся засмучацца. Уладкавацца на работу вам дапаможа студэнцкае бюро паслуг маладзёжнай сацыяльнай службы, якое размясцілася ў Мінску на вуліцы Казлова, 7. Энтузіясты прапануюць моладзі самую разнастайную пагадзінную і часовую работу. Хлопцы і дзяўчаты могуць у час канікулаў папрацаваць рэкламнымі агентамі, вартаўнікамі, прадаўцамі латкоў. Бюро прапануе работу ад мыцця акон да выгульвання сабак. Майце гэта на ўвазе, калі надумаеце папраўіць свае фінансавыя справы.

Аляксандр ВАЛАВОЙ.

Дэмакраты аб'ядноўваюць намаганні

Адбылося чарговае пасяджэнне Каардынацыйнай нарады патрыятычна-дэмакратычных сіл, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі АДПБ, БХДП, БСП, БСДГ, БНФ, НДПБ, БЗВ, Свабодных прафсаюзаў, Саюза прадпрымальнікаў.

На пасяджэнні абмяркоўвалася пытанне аб супольнай падтрымцы кандыдатаў дэмакратычных сіл, якія прайшлі ў другі тур выбараў. Прадстаўнікі дэмакратычных сіл таксама дамовіліся каардынаваць свае намаганні па кантролю за галасаваннем. Наступнае пасяджэнне нарады пройдзе пасля другога тура выбараў.

Мікола АХРЫМУК.

Маўчаць аглухлыя званы?..

Бяру на сябе смеласць сцвярджаць, што з усіх журналістаў, якія працавалі, зараз працуюць ці нават будуць працаваць у "Народнай газеце, — ніхто так дасканала не валодаў і, бадай, не будзе валодаць родным словам, як Іван Рубін. Ён быў першым штатным журналістам, які прыйшоў працаваць у "Народную газету". Ён лепей за ўсіх нас пісаў на тэму Адраджэння. Гэта было ягоным жыццём. Іван быў даверлівым, быццам дзіцё, таму жылося яму нялёгка. Ён быў ПАЭТАМ.

Новы дзень падзеі новай,
Як званар, вяшчуй, завіі
Хай звініць высока слова
На бацькоўскай роднай мове
Праўдай гневу і любові.

Чалавек, які напісаў такое, не можа не быць патрыётам сваёй краіны.

Край мой родны з Белай Вежай,
Ты зыходны мой рубеж...

Іван, Іван... У апошніх вершах адчувалася, што нешта смаліць ягонае сэрца. Але ж смерць — такога ніхто не мог прадбачыць.

На маім пісьмовым стале рукапіс апошняга зборніка вершаў і паэм Івана. Ён назваў яго "Званар". У прадмове Іван Рубін пісаў:

"Колькі гадоў, дзесяцігоддзяў маўчалі аглухлыя званы. У іх вырвалі языкі — у майго народа адабралі мову. І вось з-пад крыжа ўзняўся ссівелы званар, і зарыдала Беларусь па сваіх вялікіх сынах, успомніла, што мае і гонар, і годнасць, і мову найстаражытнейшую.

"Званар" — так называецца новы зборнік вершаў і паэм. Ён складаецца з трох раздзелаў.

"Камень віны" — нялёгкая ноша пакаяння, рэлігія любві і брацтва, якую да скону нясе раб Божы ў сэрцы, як і святыні Айчыны — святло Пагоні, вернасць магілам продкаў, абрысы роднага краю.

"Крыж на Галгофу" кожны нясе па-свойму. Цяжкі крыж і лёс дастаўся беларусу, але ён не сагнуўся, выстаяў і цяпер спакваля разгінаецца.

У кожнага ёсць свой калейдаскоп. "Мой калейдаскоп" — гэта і мая рэабілітацыя, і мая прапіска, і мая жанчына, і мае поры года.

І ўсё гэта — і грэшнае, і святое — не ўдалося знішчыць і вытравіць ніякім маньякам, засланіць трон скураным ценем.

Ім я жыву, радуюся, мучуся, плачу."

Будзем спадзявацца, што "Званар" з нашай і Божай дапамогай убачыць свет. Зараз у нас іншыя клопаты — бацькоўскія. Іванава дачка Марына заканчвае сярэднюю школу. Які шлях яна выбера ў жыцці — не ведаем. Пакуль што мы зробім усё магчымае, каб яна стала някепскім чалавекам. Такім, якім быў у сапраўднасці яе бацька.

Ад імя творчых супрацоўнікаў "Народнай газеты"
Валеры ДРАЗДОЎ,
член выканкама Рады Саюза журналістаў Рэспублікі Беларусь.

Іван РУБІН

Мой народ

Ні ў плот, ні ў азярод...
Ніхто так не абража,
Ніхто пра мой народ,
Зласлівец хіба скажа
Ці нейкі адшчапенец,
Што меў хаўрус і шэнец
Не жыць тут, а слядзіць.
Бо трэба так любіць, —
Навекі — незвычайна,
Каб выгукнуць адчайна,
Што ты сляпы, народ!
(Не быў ніколі зверам.)
З якіх жа ты парод,
Упэўненасці й веры
Дарогу ў космас торыў?
І пры вялікім рускім браце
Не быў пустым паўторам.
З пашанай кут у хаце
Гасцей пачэсных красіў
Не толькі хлебам-квасам —
Была ўсягды і песня,
Якую дужа песціў,
Гасціны знаў, застоллі.
А меч загартаваны —
Чужынцам — не патоля.
Не быў ніколі панам —
Ратаем, храбрым воем.
Нікога не няволіў,
Хоць ліха сам зазнаў.
Любіў сваіх сыноў
І, як святыню, — волю.
Ты многа свету даў!
Дасі яшчэ ты болей!

❑

Рубяжэвічы, Рубяжы...
Як вас многа ў краі родным.
Радаслоўнай вашай годнасць
Ад Раздораў, ад Раздзелаў, ад Мяжы,
Ад сялянскай горкай долі...
І ў чаканні новай волі
Поле зведала мяжы
Лёс гаротны, малачайны.
Іх знішчалі так адчайна
І прастор давалі полю.
Васількі, што на мяжы, —
Васількамі на прыполе...
Дзівам, цудам вы былі
На зыходным рубяжы,
Калі памяць набяжыць
З полем родным, домам ціхім
І з цыбатаю буслікай...
Ліха-ліха — рубяжы.
Горам-ліхам — межы.
Край мой родны з Белай Вежай,
Ты зыходны мой рубеж.
Пільна свае межы
Дом мой у тваім бязмежы
І шануй, і сцержы.
І не стану я замежным,
І не стану я чужым
Гоням і тваім магілам,
Васількам, што на мяжы.
Рубяжэвічы, Рубяжы...

Партрэт маці

Сцяжыны бадылля і лебяды
Трымаюць цяжкі час
бясхлеб'я.
Як памяць гора і бяды —
Грубыя шарачок і зрэб'е.

Пабляклыя лісты трывог
Трымцяць на зябкім ветры.
Ссівелі ўсе сляды дарог,
Сышліся разам кіламетры.

Забыты вышчарблены серп,
Абрус, як пасынак у доме, —
Ён матчын спеў і матчын гарб, —
Схіліўся сумна доле.

Не проста цень цераз пляцень,
А ўсё-ткі выгляне нядзеля.
Які ж кароткі доўгі дзень
У простай рамачцы надзеі.

Засохлы сёмухі букет —
Валошкі тры ў тваім прыполе.
Цяпер, здаецца, ўвесь
партрэт.
Якая песня — гэткі свет —
Удовіная доля.

Сыну

Быцця і існасці святло.
Спачатку за акном,
Далей — за далягляд.
За полем — лес.
За лесам — ляда.
І нараджаецца сусвет
Ужо не вузенькі, не блізкі.
А быў
Свет роднай хаты і калыскі,
Свет першых матчыных
трывог,
Дзе і няма тых трох дарог,
Ні зла, ні долі, ні дабра.
Дзе і для ісцін не пара,
Ды чалавек смяецца і злуе,
Сваё святкуе нараджэнне.
Наўны час самасцвярджэння —
Свет чысты,
светлы
і высокі.
За першым словам,
Першым крокам,
За першай гадавой зарубкай
Сталее і мужнее чалавек,
Да зброі і пяра працягваюцца
рукі.

Налібокі

Налібокі.
Дарога. Дарога!..
І лес пад аблокі,
Як вокам акінуць
Аўдавелай каліне —
Падступаецца блізка
Да цененькай вёскі,
Падпёршыся хлёстка
Пад бокі.
Налібокі — Налібокі!
І рэху прастор недалёкі —
Не дацягне дадому.
Сасняку маладому,
Напэўна, пад трыццаць.
(У лесе — прыватам —
Нашчадак традыцый.)
А вёска — як кокан.
Прасекі светлае вока
Падміргне, быццам веснічкі.
Саснячок маладзенькі
Дапяў нацянькі
Да бярозак-равесніц.
Высока-высока прадвесне
І песня,
І лес такі чалавечы
На роднай зямлі
Закараніўся навечна,
Дзе прашчур на светлай
паляне
Пусціўся, прытомлены,
ў скокі,
Назваўшы яе —
Налібокі.
(Не соладка, пэўна, жылося.)
Мажліва, адтуль павялося —
Драўляне,
Паляне,
Славяне,
Прыгожае імя —
Алеся.
Вялікі і мудры лесе!

❑

Горад, горад...
Боль мая і гордасць!
Чалавечай думкі сілуэт —
Ілюстрацыя ўсіх спектраў.
Растрывожаны, як вулей.
Шчупальцы завулкаў, вуліц,
Лініі тваіх праспектаў
Разбягаюцца нервова ў свет.
Пацяснеюць далягляду
берагі —
Мулкасць непрадбачаных
камфортаў.
Ты не стаў мне родным,
Дарагім.
Ты наўрад ці будзеш ім —
Чалавечага прастору фортка.
Бездухоўны лабірынт
Горкіх радасцей маіх
І юначых зменлівых
прычасцяў.
Дождж юлой на маставых
Захлынаецца ад шчасця.
Прарастае час праз пальцы.
І трава бетонны панцыр
Прабівае, як вякі...
Горад, горад... Ты якіх
Дачакаўся сёння лаўраў,
Чалавечых навігацый
І папрокаў, і авацый?
Горад-дом і горад-мыс,
І магчымы кампраміс
Паміж мною і табою.
Горад, горад... Прывыкаю
З доўгім болем і спакоем...
Веснім зарывам трамвай
Кружыць, кружыць
кальцавою.

❑

Зноў няхай разбудзіць бусел
Сваім клёкатам шчаслівым.
Новы дзень святлейшы будзе
Над сяйвом і свежым млівам.
Новы дзень надзеі новай,
Як званар, вяшчуй, завіі
Хай звініць высока слова
На бацькоўскай роднай мове
Праўдай гневу і любові.
Над буслянкай і асверам,
Сёння зблізку і здаля...
Круціцца з надзеяю і верай
Да дабра зямля.

❑

Колькі пражыў? Пражыву?
Толькі ці варта пра гэта.
Збочу з дарогі, прысяду
ў траву
У самым зеніце спелага лета.

Успомні сяброў... Падлічы
Ворагаў блізкіх і дальніх.
Паходня мая на плячы
Для новых надзей і світанняў?

Сціснецца сэрца, трывожна
заб'ецца.
Сцяжына. Бальшак. І шаша.
Што ж так балюча, душа,
Трудна з табой нам жывецца?

Можа, не так бы пражыў,
Калі б давялося спачатку?..

На самай апошняй мяжы
Нікому не кіну пальчатку.

Кукуе запознена птушка мая,
Колькі, зязюля, налічыш
гадоў?..
Які там наперадзе свеціць
маяк?
Ісці на яго я гатоў...

❑

О, жизнь
без завтрашнего дня!

А.Ахматава

Зноў адзіноцтва мне радня —
Жыццё без заўтрашняга дня,
Без волі, веры і сяброў...
Ці ж я змагу пачаць наноў,
З дарогі новай, новых слоў,
Усё так проста перакрэсліць,
Што я зрабіў і што прайшоў?
Атрэсці, нібы пыл з гадоў,
Каб не было відаць слядоў
Ад тых няўдач і тых грахоў...

Каб я дадому не дайшоў,
Не! Не змагу пачаць наноў!

Маналог

— Вясна...
— Не кажы,
Пражылі, дзякуй Богу,
гадок...
— Красавік і май...
І вясна бывай.
— Лета сустракай.
— Ліпень і жнівень
(І пункціраць восы)...
— Глядзіш,
І чакай ужо восень.
— Кастрычнік і лістапад...
Першы снег
Неўпапад.
— Хутка і грудзень
Астудзіць грудзі.
— І другі снег будзе.
(Ай-яй-яй).
— І зіму ўжо чакай —
Студзень і люты.
— Як хутка бяжыць час...
— Забываюць пра нас.
— Зноў вясна.
— Пражылі, дзякуй Богу, гадок...
— Ну які там
З мяне ўжо хадок...
Задышка, сэрцабіццё...

...А за годам год
І жыццё.

Не все так плохо

Спасибо вам, люди добрые

Необычный "инвестиционный проект" реализовывается акционерным коммерческим банком "Беларусбанк" в Московском районе столицы республики. Проект приносит отнюдь не материальную прибыль — слова благодарности и уважение людей. Банк — "вкладчик" Фонда поддержки обездоленных, созданного районной организацией Красного Креста.

Фонд начал работу в канун большой даты — 130-летия легендарной международной организации Красного Креста.

— Впрочем, эта дата для белорусских представителей Красного Креста носит несколько грустный оттенок, — говорит председатель районной организации Светлана Крысенко. — И вот почему. В комитете Красного Креста нашего района работает пять медицинских сестер милосердия, на попечении которых находится 120 пожилых минчан. Уход за ними возможен только на дому. Уколы, перевязки,обслуживание парализованных больных... Однако людей, нуждающихся в нашей поддержке, в районе намного больше. Но где взять средства?.. Ведь Красный Крест (единственная общественная организация, которая оказывает реальную безвозмездную помощь одинокому человеку) существует лишь на пожертвования. Знаю, что круг спонсоров мог бы быть гораздо шире, освободи государство от налогов те суммы, что перечисляют организации на наш счет. Пять лет писания писем, прошений, обращений в инстанции, к депутатам Верховного Совета — все безрезультатно.

Сегодня мы создаем клуб общения, поскольку в районе более тысячи одиноких престарелых, оставшихся по воле судьбы на склоне лет без детей и близких. Собираем их по праздникам: на Пасху, День Победы, Новый год. Чаевничают, поют песни, говорят о своем, а мы видим — проблемы и болезни в эти минуты отступают...

Что и говорить, непростая жизнь у сотрудников Красного Креста. Большой самоотдачи и, не побоюсь этого слова — самопожертвования требует от них работа. Но тем не менее люди, готовые посвятить себя заботе о больных и немощных, еще не перевелись в стране. Светлана Крысенко неоднократно подчеркивала: "мои сестрички" Елена Колосовская, Алла Дубовицкая, Валентина Пранкевич который уже год беззаветно служат обездоленным людям, день за днем отдавая им частичку своего сердца и тепла.

Парадокс, но освободи сегодня "компетентные лица" комитет Красного Креста Московского района от арендной платы за помещение и от оплаты коммунальных услуг, сэкономленных средств полностью хватило бы на содержание сестры милосердия для недавно открывшейся в микрорайоне Малиновка поликлиники.

— Всех, кто имеет свободное время и желание помочь (и не только материально), — приходите, звоните по телефону 20-79-71, — сказала на прощание председатель Красного Креста Московского района Светлана Крысенко. — Мы ждем, мы будем очень рады...

Татьяна МОКАТОВА.

Предупреждение инвалидности и реабилитация инвалидов

24—25 мая в Институте медицинской экспертизы г.Минска пройдет научно-практическая конференция по теме "Предупреждение инвалидности и реабилитация инвалидов".

На ней будут подведены итоги четырехлетней научно-технической программы по реабилитации больных и инвалидов, а также разработаны направления работы на следующие годы, касающиеся реабилитации инвалидов.

На конференции будут присутствовать руководители Министерства здравоохранения, учреждений здравоохранения и социальной защиты, а также представители других организаций.

Николай ВАСИЛЕВСКИЙ.

Святу ў гонар літары — быць!

Увесь славянскі свет сёння, 24 мая, адзначае свята свайго пісьменства

Леу КАРАІЧАЎ

Наша азбука грунтуецца на кірыліцы, якую стварылі славутыя асветнікі браты Кірыла і Мяфодзій. Родам яны з Салуні, што ў паўночнай Грэцыі, дзе ў той час было шмат славян.

Братоў запрасілі ў 862—863 г.г. у Маравію для стварэння славянскай царквы, каб процістаяць германізацыі. Яны пераклалі з грэчаскай мовы на балгарска-македонскі дыялект асноўныя царкоўныя кнігі, даўшы пачатак пісьменнасці на стараславянскай мове.

Балгарскі народ памятаў пра тое заўседы. І калі ўзніклі больш-менш спрыяльныя ўмовы, Найдзен Гераў арганізаваў святкаванне славянскага пісьменства ў маі 1857 года. Свята з гэтай нагоды хутка набыло ўсенароднае прызнанне.

Мне давялося тройчы наведаць Балгарыю. І дзе б ні заходзіла гаворка пра гэта, на твары суразмоўцаў з'яўлялася радасць.

Праваслаўная царква здаўна шануе вялікіх асветнікаў. А вось народ на Беларусі шырока даведаўся пра іх дзейнасць у маі 1990 года, калі наша рэспубліка стала на некалькі дзён цэнтрам усеславянскага свята. Прыехала шмат гасцей з Расіі, Украіны, Балгарыі, з іншых краін, з далёкага замежжа.

А пачалі рыхтаваць свята тыя, каго цікавілі карані славянскай культуры, пісьменства, хто імкнуўся дапамагчы шырокаму адраджэнню беларускага мастацтва, мовы, гістарычнай спадчыны. Быў ужо і нейкі вопыт правядзення такіх святаў, набыты ў Мурманску, Волагдзе, Ноўгарадзе, Луганску, Кіеве.

Падрыхтоўка да свята ў Мінску ішла марудна, хаця ніхто ў розных установах быццам не быў супраць. І тады прыйшлося ісці да Старшыні Вярхоўнага Савета М.І.Дземянцея. Ён хутка ўсё зразумеў, апаратыўна склікаў нараду, і ўсё стала як мае быць. Вось для мяне прыклад і дзяржаўнага дзеяча і грамадзяніна.

Сёння, на жаль, мы амаль не маем агульных святаў сярод краін-суседзяў. Святаў, якія б станоўча ўспрымаліся большасцю жыхароў, якія былі б не палітызаваныя занадта. І вось такое свята славянскай культуры, без якой немагчыма ўявіць культуру сусветную, і дапамагло б людзям больш прыязна ставіцца адзін да аднаго.

Такія святы не толькі вясёлыя скокі, песні, забавы, не толькі навуковыя канферэнцыі, але і работа душы кожнага ўдзельніка. Яно патрэбна, бо духоўна абагачае ўсіх і кожнага. Аб гэтым мы думалі тады, калі хацелі стварыць беларускі фонд славянскага пісьменства. Мы імкнуліся не толькі глыбей пазнаёміцца з культурамі іншых славянскіх народаў, але, галоўнае, падставіць плячо нашай культуры, мове, яе чысціні, нарматыўнасці, дапамагчы ўсім у свеце, хто цікавіцца нашай культурай.

Планы былі вялікія і рэальныя. Энтузіязму хапала і сілы былі, былі і добрыя кантакты са спонсарамі. Але кіраўніцтву таго яшчэ Міністэрства культуры нешта не спадабалася. Яно ўзяло стварэнне фонду пад сваю апеку (такі быў час) і... мы маем сёння тое, што маем. Бо работа на ніве культуры патрабуе прагі душы да гэтага, энтузіязму, бясспрэбніцтва і шмат яшчэ чаго. Калі ж гэтага няма, а ёсць жаданне раздаваць інтэрв'ю, патрапіць на экран тэлевізара, ухапіцца за мікрафон — то і карысці асобнаму чалавеку і ўсёй краіне — аніякай.

І, нягледзячы ні на што, у святочны дзень славянскага пісьменства хочацца падзякаваць Балгарыі за такое свята і спадзявацца, што ўсё ж яно адродзіцца ва ўсю веліч, бо гэта свята ў гонар найвялікшага вынаходніцтва — літары, у гонар культуры, у гонар мацавання душы чалавека.

Тепе-скопом!

Мини-рецензии на передачи Белорусского телевидения с 15 по 21 мая

1. Лучшая передача прошлой недели?
2. Худшая передача прошлой недели?
3. Человек недели на БТ?

Борис СТРЕЛЬЦОВ, профессор кафедры теории и практики современной журналистики Белгосуниверситета:

1. Целиком яркой публицистической передачи не было. Лишь сюжет о положении с лекарственными препаратами в "Коллаже", программе для деловых людей, 16 мая получился, на мой взгляд, убедительным, без нажима и треска, с интересным авторским видением проблемы. Остальные сюжеты в этой передаче — скрипучая полускрытая реклама, которая не может понадобиться не только массовому зрителю, но и деловым людям.

2. Образцом плохой тележурналистики может служить передача "Обновление. Хлопоты и надежды химиков Полотчины" 15 мая. Шаблонный видеоряд, однообразные интервью, без сюжета, интриги, без столкновения позиций.

По-прежнему не устраивают меня наши "Новости". Скучные сюжеты — или в республике ничего не происходит? И ведущие: молоды, но без чувств, эмоций, как манекены. Контраст с российскими ведущими поразительный!

Политическая программа "Резонанс" так и не заняла место исчезнувшего "Проспекта". Нет анализа, осмысления событий. Вместо этого простое перечисление событий на фоне кадров, взятых из позавчерашних "Новостей"! Это уж ни в какие ворота...

3. Даже если Александра Григорьевича нет в кадре, его присутствие, его "рука" чувствуется на телеэкране постоянно...

Ольга САВИЦКАЯ, кандидат искусствоведения, доцент Белорусской академии музыки:

1. Музыкальный салон Элеоноры Язерской "Франция... Песня". В чем бы ни упрекали ведущую, надо отдать должное ее индивидуальности, печать которой чувствуется на всем. В конце концов, хочется праздничной, приподнятой атмосферы.

И вторую программу отмечаю с удовольствием и не без удивления: "Нов и К" — топ-ревю". Демократично, динамично, ненавязчиво. Обаятельный ведущий.

2. Когда смотришь белорусскую эстраду, челюсти от скуки сводит. Тягостное ощущение осталось от телеконкурса молодых артистов эстрады "Золотая ростань" 17 мая. Что-то серое, невнятное, невзрачное двигается по экрану, потакая невзыскательному вкусу зрителя.

3. Дефицит личности на БТ ощущается колоссальный, выбрать "человека недели" на прошлой неделе мне не удалось.

Александр УЛИТЕНОК, главный редактор еженедельника "Свободные новости плюс":

1. Думаю, выражу мнение многих, если лучшей назову передачу "Поет Юрий Антонов". Артист привлек такое пристальное внимание прессы, а публика проявила такой интерес к скандалу Антонов — Ханок, подтвердив еще раз популярность обоих, что хочется отдать должное неувядающему таланту артиста и мужеству белорусского композитора.

2. Мне кажется, после нокаута, который произвел фильм "Ненависть" на позапрошлой неделе, политическая журналистика возродится у нас не скоро. Тщетно искал хоть одну аналитическую передачу по итогам выборов... БТ проявляет верх осторожности, оно ангажировано, послушно, делается под заказ.

3. Увы, на Белорусском телевидении личность — дефицит.

Око за око, медаль за медаль

Во Дворце спорта завершился одиннадцатый чемпионат Европы по самбо. 13 стран-участниц съехались в Минск.

Наша столица проводит соревнования столь высокого уровня не первый раз: олимпийские турниры по футболу, чемпионат Европы по волейболу и др. Тем не менее на заседании Европейской федерации самбо, что состоялась в рамках турнира, было принято решение наградить за отличную подготовку Дворец спорта памятной медалью. Ответный шаг сделали белорусы членам исполкома — вручили медали Дворца. Кроме того, обсуждались пути привлечения в эту организацию новых членов, перспективы развития самбо, финансовые проблемы. Владимир Япринцев, глава Белорусской федерации, принимал поздравления по случаю избрания вице-президентом Европейской федерации. Он также высказал готовность и в дальнейшем содействовать проведению чемпионата, который был бы невозможен без внимания фирмы "Triple" и Белвнешэкономбанка. Они надеются остаться постоянными спонсорами белорусских самбистов.

Татьяна КИСЛИЦЫНА.

ЗАМЕЖЖА

*ІТАР-ТАСС *ІНТЭРФАКС *НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Пульс дня

Сустрэча адкладзена

РАБАТ. Правядзенне сустрэчы на вышэйшым узроўні кіраўнікоў шэрагу арабскіх дзяржаў у Касабланцы адкладзена, гаворыцца ў распаўсюджаным тут афіцыйным камюніке. Гэта рашэнне прынята пасля кансультацый паміж зацікаўленымі бакамі.

Місія з Расіі

УЛАН-БАТАР. Сустрэчай паміж сакратаром савета бяспекі Манголіі Жаргалсайханой Энхсайханам і намеснікам сакратара Савета бяспекі Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Рубанавым пачаўся афіцыйны візіт расійскай дэлегацыі, якая прыбыла ў манголь скую сталіцу. У цэнтры абмеркавання — пытанні супрацоўніцтва двух ведамстваў.

Пратэст ураду ЗША

ПЕКІН. Міністр замежных спраў КНР Цянь Цічэнь ад імя кітайскага ўрада заявіў ураду ЗША рэзкі пратэст у сувязі з рашэннем вашынгтонскай адміністрацыі прадаставіць прэзідэнту Тайваня Лі Дэнхуэю магчымасць наведаць ЗША з прыватным візітам. Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Кітая выклікаў пасла ЗША ў Пекіне Стэплтана Роя ў МЗС і заявіў яму, што рашэнне Вашынгтона парушае кітайска-амерыканскія сумесныя дакументы.

Шырак паедзе ў Вашынгтон

ВАШЫНГТОН. Новы прэзідэнт Францыі Жак Шырак наведае Вашынгтон перад сустрэчай "вялікай сямёркі", якая адбудзецца ў наступным месяцы ў Канадзе. Як паведаміў Белы дом, кіраўнік французскай дзяржавы сустрэнецца з прэзідэнтам ЗША Білам Клінтанам 14 чэрвеня, за дзень да пачатку ў Галіфаксе штогадовай эканамічнай нарады ў вярхах вядучых індустрыяльных дзяржаў.

Пытанне глыбока вывучаецца

ТОКІО. Японскія ўлады афіцыйна прыступілі да вывучэння пытання аб прымяненні да секты "АУМ сінрыкіо", якая падазраецца ў арганізацыі актаў масавага тэрору, нацыянальнага закона аб падрыўной дзейнасці, на аснове якога гэта арганізацыя можа быць забаронена як "наносячая ўрон дзяржаве".

Всемирный банк — за экономическое оздоровление Балтики

Всемирный банк присоединился к международным усилиям, направленным на то, чтобы остановить экологическую деградацию Балтийского моря путем осуществления семи проектов в трех прибалтийских странах, Польше и России.

Существенное внимание в работе над этими проектами будет уделено совершенствованию муниципальных служб водоснабжения и канализации, что должно снизить слив загрязненных отходов непосредственно в Балтийское море или во впадающие в него крупные реки.

Будут поддерживаться демонстрационные мероприятия в сфере управления сточными водами в сельской местности и снижения объемов стоков сельскохозяйственного производства, попытки улучшить управление экологически ценными прибрежными лагунами и сильно увлажненными землями вдоль побережья балтийских государств.

Из семи проектов по два будут осуществляться в Латвии и Литве и по одному — в Эстонии, Польше и России.

Общая стоимость составит около 1 млрд. долларов. Всемирный банк предоставит 240 млн. долларов. Остальные средства будут внесены региональными правительствами и собраны в виде коллективных грантов со стороны Европейского союза, Финляндии, Дании, Швеции и Соединенных Штатов. В финансировании проекта также примет участие Норвегия, сообщает Всемирный банк.

К опасности шагнув под землю...

На шахтах объединения "Донецкуголь" в 1994 году произошло 4614 несчастных случаев, из них 36 — со смертельным исходом. Об этом сообщила газета стачечного комитета объединения "Новости и события".

На шахтах предприятия работает около 100 000 человек. Как сообщает газета, потери рабочего времени соответствуют простою в течение года пятитысячного коллектива. 9000 человек работает в условиях повышенной температуры воздуха.

"Новости и события" также сообщают, что число нарушений прав трудящихся со стороны администраций предприятий постоянно растет. Министерство угольной промышленности Украины до сих пор не приняло программу улучшения безопасности труда.

Мы не можам страчваць расійскі рынак...

Белавежскія пагадненні з'явіліся папярэднікам вялікіх палітычных і сацыяльных ломак і ўзрушэнняў. Былыя саюзныя рэспублікі назвалі сябе суверэннымі дзяржавамі. Аднак у хуткім часе стала зусім відавочна, што ні адна з іх у адзіночку выжыць не здольна. Рэспубліка Беларусь адной з першых зразумела гэту рэальнасць і паступова пачала рыхтаваць умовы для правядзення эканамічных рэформ, арыентуючыся не на прывідныя блокі і саюзы за межамі краін СНД, а на цесную інтэграцыю ў рамках Садружнасці, перш за ўсё з Расіяй. Аб усіх "за" і "супраць" гэтай інтэграцыі гутарка карэспандэнта Белінфарма з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Расійскай Федэрацыі Віктарам ДАНІЛЕНКАМ.

— Рэінтэграцыя ў "рамках дзвюх" ва ўзнікшай сітуацыі ўжо набывае рэальныя рысы. І ўсё ж, Віктар Дзмітрыевіч, наколькі плануемае такое глыбокае ўваходжанне Беларусі ў эканоміку Расіі спалучаецца з даўгачаснымі інтарэсамі народаў дзвюх незалежных дзяржаў?

— Трэба дакладна вызначыць, што ініцыятыва стварэння такога эканамічнага саюза належыць Беларусі. І з пачатку яго ажыццяўлення, а гэта 1992 год, пройдзены вялікі шлях па падрыхтоўцы базы для цеснай эканамічнай інтэграцыі з Расіяй. Толькі ў гэтым годзе падпісана 18 дагавораў і пагадненняў на самым высокім узроўні, і ўсе яны пачынаюць працаваць. Дзяржаўная дума Расіі ўжо ратыфікавала рашэнне ўрада аб выдзяленні Беларусі 150 мільярдаў рублёў крэдыту. На чарзе — ратыфікацыя парламентам Дагавора аб дружбе і супрацоўніцтве. Што ж датычыцца пытанняў інтэграцыі нашых эканомік, то, мне здаецца, найбольш бачна і ўражліва на гэтае пытанне адказаў народ Беларусі, выказаўшы на рэферэндуме сваё жаданне на эканамічнае супрацоўніцтва з Расіяй. Варта заўважыць, што ўся эканоміка Беларусі фарміравалася на базе цеснай інтэграцыі з эканомікамі іншых рэспублік былога Саюза. Краіны СНД былі і застаюцца асноўнымі гандлёва-эканамічнымі партнёрамі, пры гэтым найбольшы знешнегандлёвы абарот рэспубліка мае з Расіяй: аб'ём беларускага імпарту ў Расію складае звыш 80 працэнтаў, такі ж прыкладна і аб'ём экспарту. Расія практычна поўнасцю забяспечвае патрэбнасці па важнейшых відах сыравіны, нафты, газу. З Беларусі ў Расію ідуць аўтамабілі, калійныя ўгнаенні, хімічныя валокны і ніці, станкі, трактары, шыны і многае-многае іншае. Я хацеў бы спытаць у тых, хто супраць такой цеснай інтэграцыі: дзе той Захад, куды можна пастаўляць гэту добрую, але не зусім канкурэнтаздольную прадукцыю?

— Ці ёсць гарантыя, што інтэграцыя будзе садзейнічаць мадэрнізацыі вытворчасці і пераходу да рынкавай эканомікі? Ці не закансервуе гэта яе ранейшыя, узнікшыя пры сацыялізме, архаічныя адносіны і прамысловасць Беларусі і далей будзе арыентавана па якасці і па колькасці выключна на непатрабавальнага расійскага спажыўца? Ці не затрымаюць такая рэстаўрацыя і вяртанне да камандна-размеркавальнай эканомікі выхад да рынку?

— Яшчэ раз падкрэслю: нам нельга страчваць свае рынкі, а асабліва расійскі. У прамысловасці мы працуем нядрэнна. Скажу больш — мы добра працуем.

Беларуская прадукцыя ў рэкамендацыях не мае патрэбы, яе заўсёды ахвотна бралі ў краінах Садружнасці. І размова можа ісці цяпер не аб змяненні спецыялізацыі рэспублікі, а толькі аб інтэграцыі патэнцыялаў Расіі і Беларусі ў рамках адносна нешматлікіх транснацыянальных карпарацый ці фінансава-прамысловых груп. Тыя, хто лічыць, што эканамічны саюз з Расіяй толькі прыпыніць спад нашай эканомікі і нібы "закансервуе" наша тэхнічнае развіццё на цяперашнім узроўні, памыляюцца. Падпісанае пагадненне аб стварэнні фінансава-прамысловых груп, якія стымулююць структурную перабудову вытворчасці непасрэдна на прадпрыемствах з улікам патрабаванняў еўрапейскага рынку, і задачы павышэння канкурэнтаздольнасці беларускіх прадпрыемстваў у рамках беларуска-расійскага супрацоўніцтва ўжо прыносяць свой плён і канкрэтныя вынікі. У завяршальнай стадыі знаходзіцца афармленне ФПГ "Славянская папера". Яшчэ сем такіх груп фарміруецца: па вытворчасці колавых трактараў, кормаўборачнай і кар'ернай тэхнікі, стварэнню элементнай базы мікраэлектронікі, тэхналагічнага абсталявання вытворчасці і ў іншых галінах.

— Многія сродкі масавай інфармацыі, вядомыя палітыкі ў Расіі адкрыта спрабуюць "разыграць беларускую карту", прадказваючы, што "нерэфарміраваную эканоміку Беларусі наўрад ці ўтрымае на плаву, ды і наўрад ці захоча ў канчатковым выніку зрабіць гэта нават Расія". Відаць, камусьці ў Расіі выгадна сарваць працэсы інтэграцыі: маўляў, палітыкам стала вельмі цяжка тлумачыць галодаму расійскаму падаткаплацельшчыку, што ён вымушаны больш туга зацягнуць пояс, бо трэба выцягваць "бедных беларусаў"?

— Такія абывацельскія настроі ёсць і сярод расійскіх дэмакратаў, якія не жадаюць бачыць далей уласнага носа і нават на імкненні брацкіх народаў да яднання спрабуюць нагрэць рукі. Але такія сцвярджэнні сёння начыста разбівае волевыяўленне насельніцтва Беларусі, якое выказалася за далейшае збліжэнне з Расіяй на праведзеным рэферэндуме. Ужо сёння зразумела, што на тэрыторыі былога Саюза адбылася падзея, якая можа і павінна стаць паваротнай у лёсах не адных беларусаў, а дзесяткаў мільёнаў людзей на ўсёй тэрыторыі Садружнасці, кінутых у бездань беднасці і разладу. Мяне радуе, што Беларусь першай пракладае шлях да рэальнага аб'яднання. І, нягледзячы на прадраканні скептыкаў, працэс збліжэння пайшоў па ўсіх напрамках. І, я веру, у такім збліжэнні Беларусь зарэкамендуе сябе раўнапраўным партнёрам.

— Аб гэтым, мяркуючы па ўсім, сведчаць і дакументы, падпісаныя ў апошні час...

— Па-першае, я хацеў бы сказаць, што для нас Садружнасць Незалежных Дзяржаў сёння — гэта перш за ўсё кожная канкрэтная дзяржава, з якой мы жадаем мець трывалыя двухбаковыя ўзаемавыгадныя адносіны. Але прыярытэты на гэтым этапе мы, безумоўна, аддаём Расіі.

А што датычыцца дакументаў, аб якіх вы гаворыце, то ўступленне іх у сілу (Пагадненне аб стварэнні Мытнага саюза і Пратакол аб увядзенні рэжыму свабоднага гандлю без выключэнняў і абмежаванняў і звязаныя з гэтым змена экспартных пошлін, прадастаўленне суб'ектам гаспадарання Беларусі магчымасці закупляць прадукцыю па ўнутраных расійскіх цэнах) дасць магчымасць стабілізаваць эканоміку. Стварэнне зоны свабоднага гандлю з адменай тарыфных і нетарыфных абмежаванняў, падпісанне пагадненняў аб узаемнай канвертацыі валют практычна здымаюць бар'еры ва ўзаемаразліках, чаго так чакалі кіраўнікі нашых прадпрыемстваў... Кожнае пагадненне з пакета дакументаў, падпісаных з Расіяй, само па сабе жыццёвае і прадыктавана патрабаваннем рэальнасці. Усе пагадненні накіраваны не толькі на паглыбленне інтэграцыі, але і на стварэнне прадпасылак для работы ва ўмовах раней існуючай, а цяпер разбуранай інтэграцыі. Дружалюбны і ўзаемавыгадны, а гэта, паверце, не пустое слова, характар беларуска-расійскіх адносін, узаемная зацікаўленасць у паляпшэнні і расшырэнні супрацоўніцтва на двухбаковай аснове, надзейныя партнёрскія адносіны выгадныя і Расіі, і Беларусі. І я перакананы — мы іх умацуем і разаўём.

Ірына ГАРАНІНА,
Белінфарм.

Масква.

По мнению Горбачева, перестройку предали

"Предательство везде и во всем" — так оценивает ситуацию в России бывший президент бывшего Советского Союза Михаил Горбачев.

Он заявил об этом на встрече с представителями местной интеллигенции в Музее политической истории Санкт-Петербурга.

Перестройка, по мнению Горбачева, "закончилась с победой над ГКЧП". "Процесс превращения Советского Союза в цивилизованное государство на этом прервался", — отметил Михаил Горбачев. Причинами, считает он, являются "неиспользованный кредит доверия к начавшим перестройку", а также распад Советского Союза. Свою задачу бывший президент Советского Союза видит в "способствовании проведению истинно демократических выборов". Оценивая деятельность Владимира Ленина, Горбачев отметил, что самой лучшей чертой этого политического деятеля он считает "способность вовремя изменять свое решение и поведение".

Наибольшим политическим авторитетом для Горбачева является Георгий Плеханов, "человек, совмещавший в себе верность идеалам социализма с приверженностью демократии".

Интересы США и Украины пересеклись в небе

Представители правительств США и Украины подписали протокол о сотрудничестве в области гражданской авиации.

Условиями протокола четырем авиалиниям с каждой стороны разрешается организация регулярных пассажирских рейсов и двум авиалиниям с каждой стороны — регулярных грузовых рейсов, при этом общее количество рейсов составит 22 в неделю. По условиям протокола авиалинии могут вступать в партнерские отношения с авиалиниями других стран, в том числе третьих стран, на ограниченной основе.

Самолеты авиакомпаний США смогут совершать рейсы в Киев, Львов, Одессу, Днепропетровск и еще три украинских города, которые будут определены позже, а также в 10 украинских городов в рамках совместной деятельности с украинскими авиалиниями.

Самолеты украинских авиакомпаний смогут совершать рейсы в Нью-Йорк, Чикаго, Вашингтон, Лос-Анджелес и Бангор (штат Мэн) и еще в три города США, которые будут определены позже, а также в 10 городов США в рамках совместной деятельности с авиалиниями США.

Кроме того, чартерные авиалинии каждой страны могут осуществлять до 225 рейсов в год, при этом авиалинии могут заключать договоры с автотранспортными компаниями страны-партнера для обеспечения более эффективной доставки грузов.

Как Коналю удивили всех...

Преступники не предполагали, что погибнут от столкновения с маленьким "уазиком"

В тот день в подмосковном Серпухове инкассаторы сопровождали огромную сумму денег... Внешне ничего не предвещало беды, но вдруг движущийся по встречной полосе ГАЗ-53 выскочил наперерез небольшому "уазику". Столкновение было неожиданным и тяжелым — лоб в лоб. Оба бандита, находившиеся в кабине грузовика, были мгновенно раздавлены двигателем своего автомобиля, который от удара с "уазиком" сорвало с рамы и втолкнуло к ним в кабину... Личности преступников, вооруженных, а также ранее судимых, установлены. На что они рассчитывали — установить сложно. Наверное, на легкую добычу больших денег? Их нет — нет и ответа. А как же экипаж "уазика"? С ним оказался полный порядок. "Уазик" Коналю пострадал незначительно: помялся бронированный передок, треснуло лобовое стекло. Так был открыт счет нападений на машины российской фирмы Коналю.

Кстати, впоследствии варианты суровых по своей жестокости нападений преступников на бронированные автомобили нового поколения были различны. Очевидно одно — эти машины спасли жизни уже более двадцати инкассаторов.

Развернувшаяся в России конверсия дала немало положительного. Еще в конце 1989 года группа инженеров-энтузиастов создала в Набережных Челнах предприятие под названием "Коналю": решили освоить выпуск легкого броневика для инкассации. Идея довольно скоро была реализована, тщательно проверена и испытана. За основу брались автомобили УАЗ, для их бронирования использовали конструкционный алюминий, разработанный в авиационной промышленности для обшивки истребителей. Отсюда и сокращение — "Коналю". Новые "крепости на колесах" оказались в два раза легче и в два-три раза дешевле аналогичных зарубежных образцов, таких, как БМВ, "Ляббе", "Форд", а это позволило брать больше груза при сокращении изнашиваемости автомобиля. Коналю "пристреляли" из различных видов стрелкового автоматического оружия, опробовали в условиях полигона.

Вскоре автновинка стала очень популярной в России, странах СНГ и в Прибалтике. Самое интересное, что штат предприятия из чуть более ста работников сегодня активно наращивает выпуск своей продукции. С конвейера сошла уже почти тысяча этих машин (заинтересовались? — тел. (0172) 96-44-54). В том числе произведены авто и по индивидуальным заказам. Коллективу молодого предприятия еще предстоит улучшить системы кондиционирования, пожаротушения, блокировки дверей, отделку салона, дизайн. Инженерная мысль, как, впрочем, и жизнь, не стоит на месте. Еще предстоит создать новые материалы, освоить высокие конверсионные технологии, соответствующие мировому уровню в подобной области техники. А пока: "ни пуха, ни пера, Коналю"...

Сергей ОВЧИННИКОВ.

ПРАГРАМА ТЭЛЕПЕРАДАЧ

Серада, 24 мая

Беларускае тэлебачанне

15.00 Навіны.
15.10 "Дзяржаўная граніца". Фільм 1-ы. "Мы наш, мы новы..."
16.20 Іграе Мінскі маладзёжны ансамбль скрыпачоў музыкальнага вучылішча імя М.Глінкі.
16.40 SOS.
16.45 "Так гэта было..." Вайна з салдацкага акопа.
17.05 "Наш вечны зніч". Частка 3-я.
17.35 "Вясна і "Каханачка". Народны ансамбль бытавых інструментаў Лідскага раёна.
18.00 АТН, Бі-бі-сі, Сі-эн-эн.
18.45 Футбол. Алімпійскі адборачны турнір. Зборная Беларусі — зборная Нарвегіі.
